Tekst jest w trakcie tlumaczenia na polski

Па словах **кс. Яна Радзюка,** духоўныя сустрэчы для маці клерыкаў розных курсаў сталі ўжо традыцыйнымі. Сёлета яны адбудуцца на тэму “ *Роля сям’і ў выхаванні будучых святароў* ” пад кіраўніцтвам кс. **Яна Сарэлы,** духоўнага айца семінарыі. На рэкалекцыях запланаваны духоўныя практыкаванні, малітвы, канферэнцыі. У мам будзе магчымасць задаць пытанні, пазнаёміцца з укладам семінарыйнага жыцця.

З 19 па 22 ліпеня семінарыя запрашае міністрантаў на рэкалекцыі аб распазнанні паклікання, якія правядзе духоўны айцец семінарыі **кс. Тадэвуш Крыштопік.** Пасля гэтага 23 ліпеня а 10-й гадзіне адбудуцца ўступныя экзамены для будучых алюмнаў: на веданне рэлігіі, пытанняў веры, гісторыі і жыцця Гродзенскай дыяцэзіі.

*– Ужо ёсць некалькі чалавек, якія падалі дакументы на навучанне ў семінарыі. Пасля рэкалекцый і экзаменаў можна будзе ўжо казаць пра колькасць першакурснікаў у новым акадэміным годзе,* – распавёў кс. Ян Радзюк.

Пералік дакументаў, неабходных для паступлення ў семінарыю:

• пасведчанне аб святым хросце;

• пасведчанне аб канфірмацыі;

• пасведчанне аб катэхетычным навучанні;

• пасведчанне аб сакраманце сужэнства бацькоў;

• рэкамендацыйны ліст ад пробашча парафіі;

• пасведчанне аб агульнай сярэдняй адукацыі/ атэстат (вынікі тэсціравання);

• медыцынская даведка (форма 086);

• ваенны білет (пасведчанне прызыўніка);

• біяграфія (напісаная ўласнаручна);

• заява (з указаннем матывацыі паступлення ў семінарыю);

• пашпарт; копія старонкі з фотаздымкам;

• 4 каляровыя фотаздымкі (3x4) (у пінжаку, пад гальштукам).